5. *Иконников, А. В.* Символика пространственной формы монастырского комплекса / А. В. Иконников // Монастыри – культурные и духовные центры России и Европы. История и современность / Рос. ин-т культурологии, Рос. ком. по селам и малым городам – ЕКОВАСТ. – М., 2003. – С. 39–47.

6. *Лидов, А. М.* Новые Иерусалимы. Создание образов Святой Земли как основа христианской культуры / А. М. Лидов // Новые Иерусалимы. Перенесение Сакральных пространств в христианской культуре : материалы междунар. симп. ; ред.-сост. А. М. Лидов. – М., 2006. – С. 13–14.

6. Монастырский распев // Православная энциклопедия : в 46 т. / под ред. Патриарха  Моск. и всея Руси Кирилла. – М., 2017. – Т. 46. – С. 539–545.

7. Монашество // Православная энциклопедия : в 46 т. / под ред. Патриарха  Моск. и всея Руси Кирилла. – М., 2017. – Т. 46. – С. 567–651.

8. *Мартынов, В. И.* История богослужебного пения : учеб. пособие / В. И. Мартынов. – М. : Федер. арх. [и др.], 1994. – 239 с.

# СПЕЦЫФІКА САЦЫЯЛЬНЫХ ФУНКЦЫЙ КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ

***І. І. Бамбешка,***
*старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Пытанне аб грамадскім прызначэнні музеяў мае даўнюю гісторыю. Аднак тэарэтычная распрацоўка праблемы сацыяльных функцый музея стала магчымай толькі на пэўным этапе развіцця музеязнаўства. Пачатак даследаванням акрэсленай праблемы паклаў у сярэдзіне 1960-х гг. вядучы савецкі музеязнавец А. М. Разгон, тады – намеснік дырэктара па навуцы НДІ культуры, падчас працы над другім выданнем «Асноў савецкага музеязнаўства», якое так і не было апублікавана [3, с. 51]. У другой палове 1960-х – сярэдзіне 1970-х гг., нягледзячы на нязначную колькасць артыкулаў на акрэсленую праблематыку, былі вылучаны дзве сацыяльныя функцыі музея: дакументавання і адукацыі і выхавання. У наступныя дзесяцігоддзі, асабліва ў другой палове 1970-х – пачатку 1980-х гг., колькасць публікацый, прысвечаных сацыяльным функцыям, значна павялічылася. Аўтарамі іх былі вядучыя тэарэтыкі і практыкі музейнай справы СССР: А. М. Разгон, Д. А. Равіковіч, Ю. П. Пішчулін, А. Б. Закс і іншыя [4, 5, 6, 7, 8]. У навуковую дыскусію аб сацыяльных функцыях музея ўключаліся спецыялісты су-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

межных дысцыплін: мастацтвазнаўства, філасофіі, сацыялогіі, педагогікі і г. д., такім чынам пашыраючы іх [10, с. 199; 2, с. 7]. Так, акрамя двух згаданых функцый, пачалі вылучаць функцыі даследчую, ахоўную, задавальненне грамадскага інтарэса да помнікаў прыроды і культуры, аксіалагічную, рэкрэацыйную, інфармацыйную, сацыялізацыі асобы, эканамічную і эстэтычную, камунікацыйную і рэпрэзентатыўную функцыі. Пытанне сацыяльных функцый застаецца дыскусійным і сёння.

Аднак, на наш погляд, пры ўсёй разнастайнасці падыходаў усе пералічаныя функцыі з'яўляюцца вытворнымі ад трох базавых: функцый дакументавання, адукацыі і выхавання і рэкрэацыйнай.

Функцыя дакументавання (уласна музейная функцыя) прадугледжвае мэтанакіраванае адлюстраванне ў музейным зборы з дапамогай музейных прадметаў развіцця грамадства і прыроды. Названая функцыя выклікана грамадскімі патрэбамі эканамічнага, навуковага і культурнага характару ў камплектаванні, захаванні аб'ектыўных сведчанняў гэтага развіцця.

Адукацыйна-выхаваўчая функцыя абумоўлена інфармацыйнымі і экспрэсіўнымі ўласцівасцямі музейных прадметаў, а таксама пазнавальнымі і культурнымі запытамі грамадства да музея. Яна ўключае ў сябе як асветніцкія, так і адукацыйныя аспекты.

Функцыя арганізацыі вольнага часу адпавядае патрэбам у культурных формах правядзення вольнага часу, эмацыянальнай разрадцы і інш. Гэта функцыя з'яўляецца вытворнай ад функцыі адукацыі і выхавання, паколькі наведванне музеяў у вольны час звязана, як правіла, з матывамі пазнавальна-эмацыянальнага характару і ў гэтым плане ўяўляе сабою спосаб рэалізацыі адукацыйна-выхаваўчых задач музея. У рэчышчы апошніх тэндэнцый развіцця музейнай справы дадзеная функцыя набыла новае гучанне. Калі ў пачатку ХХ ст. Ф. І. Шміт толькі акрэсліваў неабходнасць улічваць дадзеную функцыю: «У музей шырокія масы насельніцтва ходзяць у непрацоўны час, у дні адпачыну, для <…> культурных забаў. З гэтым неабходна лічыцца» [12, с. 55], то большасць сучасных даследчыкаў канстатуюць актыўнае ўкараненне рэкрэацыйна-забаўляльнай складаючай ў дзейнасць музея, што абумоўлена «ўспрыняццем культуры як з'явы геданістычнага парадку», якая павінна задавальняць, супакойваць, забаўляць [9; 11; 1, с. 48].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пералічаныя сацыяльныя функцыі ўзаемазвязаны паміж сабою, яны пастаянна развіваюцца. Іх дынамізм абумоўлены зменамі сацыякультурнага кантэксту, эвалюцыяй запытаў, інтарэсаў і патрэб грамадства. Разам з тым можна сцвярджаць, што сацыяльныя функцыі музея нязменны, паколькі дакументуючае і адукацыйна-выхаваўчае значэнне музея застаецца нязменным на розных этапах грамадскага развіцця. Менавіта перманентнасць названых функцый, іх стабільнасць дазваляе лічыць іх базавымі для любога музея незалежна ад профілю і іншых характарыстык; краязнаўчыя музеі выконваюць тыя ж базавыя функцыі, што і астатнія музеі. Аднак іх спецыфіка заключаецца ў тым, што яны ў найбольшай ступені сканцэнтраваны на канкрэтнай тэрыторыі, якая можа быць абмежавана вобласцю, раёнам, горадам ці іншым населеным пунктам. Так, функцыя дакументавання прыродных, культурна-гістарычных, сацыяльна-эканамічных і іншых аспектаў жыццядзейнасці пэўнага геаграфічнага рэгіёна (вобласці, раёна ці горада) рэалізуецца на аснове вывучэння, захавання і адлюстравання ў прасторы музея помнікаў культуры, гісторыі і прыроды пэўнай мясцовасці, дзе знаходзіцца музей, іншымі словамі – рэгіянальнай гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны.

Асаблівасць адукацыйна-выхаваўчай функцыі ў дачыненні да краязнаўчых музеяў заключаецца ў тым, што яны дзякуючы спецыфічным уласцівасцям музейных прадметаў здзяйсняюць перадачу наведвальнікам культурнага вопыту і інфармацыі аб традыцыях і нормах, характэрных для дадзенай мясцовасці. Праводзячы на аснове музейных прадметаў адукацыйную дзейнасць, краязнаўчыя музеі не толькі распаўсюджваюць веды аб лакальнай тэрыторыі, але і закладваюць базіс для замацавання рэгіянальнай ідэнтычнасці мясцовага насельніцтва, уцягваючы яго ў працэсы актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны. Менавіта дзякуючы гэтай функцыі музей здольны ўздзейнічаць на свядомасць і светаўспрыманне наведвальніка. Краязнаўчы музей – гэты месца канцэнтрацыі гістарычнай памяці, дзе фарміруюцца традыцыі паводзін соцыума, грамадзянская пазіцыя, маральныя паводзіны.

Рэгіянальны аспект функцыі арганізацыі вольнага часу часцей за ўсё звязаны з тым, што краязнаўчы музей можа выступаць адзінай установай на канкрэтнай тэрыторыі для культурнага правядзення вольнага часу людзей, якія на ёй пражыва-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

юць. У сувязі з гэтым краязнаўчы музей можна разглядаць як адзін са сродкаў міжасабовых зносін на аснове агульных культурных пераваг. Ён бярэ на сябе ролю цэнтра творчай актыўнасці, крэатыўных ініцыятыў, асабовага развіцця, спалучаючы ў сабе рысы такіх устаноў культуры, як клуб, тэатр, творчая майстэрня і інш.

Такім чынам, краязнаўчы музей як гістарычна абумоўлены інстытут сацыяльнай памяці, пры дапамозе якога рэалізуецца грамадская патрэба лакальнага соцыума ў адборы, захаванні і рэпрэзентацыі спецыфічнай групы культурных і прыродных аб'ектаў, якія ўсведамляюцца як каштоўнасць і падлягаюць выключэнню з навакольнага асяроддзя і перадачы ад пакалення да пакалення, выконвае такія ж сацыяльныя функцыі (дакументавання, адукацыі і выхавання і рэкрэацыйную), што і астатнія музеі. Аднак своеасаблівасць краязнаўчага музея накладае адбітак і абумоўлівае спецыфічнасць пералічаных функцый.

---

1. *Абанкина, Т. В.* Культура постиндустриального общества. Тенденции и модели использования культурных ресурсов для устойчивого регионального развития / Т. В. Абанкина // Справочник руководителя учреждения культуры. – 2007. – № 8. – С. 47–53.

2. *Бестужев-Лада, И.* Музей в системе культуры / И. Бестужев-Лада, М. Озёрная // Декоративное искусство СССР. – 1976. – № 9. – С. 6–10.

3. *Закс, А. Б.* Динамика социальных функций музеев СССР / А. Б. Закс // Музеи мира : сб. науч. тр. / отв. ред. Е. Е. Кузьмина. – М., 1991. – С. 51–66.

4. *Разгон, А. М.* Место музееведения в системе наук / А. М. Разгон // Музей и современность : сб. науч. тр. / Центр. Музей революции СССР. – М., 1986. – С. 43–47.

5. *Пишулин, Ю. П.* Развитие социальных функций советского музея / Ю. П. Пишулин // Ленинские принципы культурного строительства и современность: 60-летию Великого Октября посвящается : сб. ст. / редкол.: Т. А. Кудрина [и др.]. – М., 1978. – С. 102–111. – (Труды ; т. 74).

6. *Равикович, Д. А.* Динамика социальных функций музеев различных профилей в современных условиях (научные рекомендации для аспирантов). – М., 1986. – 84 с.

7. *Равикович, Д. А.* Социальные функции и информационная система музея : сб. науч. тр. / Д. А. Равикович // Теоретические вопросы научно-просветительной работы музеев (По материалам социол. исследований). – М., 1984. – С. 8–25. – Вып. 133.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. *Равикович, Д. А.* Социальные функции краеведческого музея / Д. А. Равикович // Музей и посетитель. – Вып. 3: вопросы социологического исследования в области музееведения / сост. В. А. Пронин. – М. : [б. и.], 1975. – С. 16–38. – Т. 65.

9. *Скрипкина, Л. И.* Актуальные проблемы музейного дела России на современном этапе / Л. И. Скрипкина // Новации в развитии музейного мира России в первое десятилетие XX века. – Новосибирск, 2011. – С. 8–17.

*10.* Социальные функции музея: споры о будущем (материалы дискуссии в отделе музееведения НИИ культуры) // Музееведение. На пути к музею XXI века. – М., 1989. – С. 186–204.

*11. Шляхтина, Л. М.* Современный музей: идеи и реалии / Л. М. Шляхтина // Вопросы музеологии. – 2011. – № 2. – С. 14–19.

*12. Шмит, Ф. И.* Музейное дело: Вопросы экспозиции / Ф. И. Шмит ; Гос. ин-т истории искусств. – Л. : Academia, гос. тип. изд-ва «Ленингр. правда», 1929. – 245, [1] с.

# ТЭМА «МАЛОЙ РАДЗІМЫ» Ў КАНТЭКСЦЕ ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ СУЧАСНАЙ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

***В. М. Белакурскі,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук Беларускаага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дынамічныя змены, якія адбываюцца сёння ў жыцці беларускага грамадства, востра паставілі пытанне аб духоўна-маральных каштоўнасцях і іх месцы ў адукацыі і выхаванні сучаснай моладзі. Патокі гедэністычнай маралі з экранаў тэлевізараў і іншых СМІ, культ асалоды ў віртуальнай прасторы – ўсё гэта нярэдка аказвае даволі моцнае ўздзеянне на маладога чалавека. «Узоры» паводзін дэманструюць героі амерыканскіх баевікоў, крымінальныя аўтарытэты, скандальныя прадстаўнікі шоу-бізнесу, якія прапануюць маргінальнае разуменне сэнсу жыцця, а таксама спосабаў праяўлення адносін да свайго народа і краіны.

Адной з найважнейшых праблем духоўна-маральнага выхавання студэнцтва становіцца ў наш час праблема фарміравання і развіцця ў яго каштоўнасных адносін да сваёй «малой радзімы». З гэтым звязана не толькі разуменне неабходнасці захавання гісторыка-культурнай спадчыны сваёй бацькаўшчы-